# Еўрапейскі кангрэс па гісторыі навукі

Сёння асабліва востра стаіць задача пабудовы тэорыі развіцця навукі, якая растлумачвае і раскрывае механізмы паспяховага навуковага функцыяніравання і яе прагрэсіўнага развіцця. Гістарычным даследаванням у розных сферах ведаў належыць у гэтай сувязі асаблівае месца: менавіта яны могуць паслужыць свайго роду базісам для абагульненняў як для стварэння агульнай тэорыі навукі, так і для практычных рэкамендацый у сферы кіравання навукай і яе арганізацыі.

**З 24 па 26 чэрвеня 1998 г. у г. Страсбург (Францыя) праходзіў міжнародны кангрэс "Гісторыя навукі і тэхналогіі ў адукацыі і навучанні ў Еўропе".** Ён праходзіў пад эгідай ЮНЕСКА. У рабоце кангрэса ўдзельнічала больш за 120 вучоных з Францыі, Германіі, Англіі, Галандыі, Бельгіі, Італіі, Іспаніі, Партугаліі, Расіі, Украіны. Трэба адзначыць, што ўпершыню на форуме прысутнічаў прадстаўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі.

На кангрэсе абмяркоўваліся актуальныя праблемы гісторыі навукі, трансфармацыі ведаў у навучальныя комплексы (універсітэты, школы, ліцэі і г. д.), а таксама арганізацыя і каардынацыя далейшых даследаванняў гісторыі навукі ў сістэме еўрапейскай адукацыі і ў навуковых структурах.

Выступілі буйнейшыя спецыялісты ў гэтай сферы: М.Вілкс (Кембрыдж), Х.Хозель (Парыж), А.Міллер (Лондан), О.Ларсен (Осла), Х.Браун (Гамбург), Я.Фолта (Прага), Ф.Хеллін, В.Наттан (Лондрэс), В.Шэа (Страсбург), М.Барс (Брауншвейг), Ф.Шабадвары (Будапешт) і інш. Яны прадстаўлялі розныя гістарычна-навуковыя школы, накірункі.

Прызнанне гісторыі навукі ў якасці самастойнай навуковай дысцыпліны адбылося ў 1892 г., калі ў Францыі была створана першая спецыяльная кафедра. Цяпер больш за 500 вучоных вывучаюць гісторыю прамысловых тэхналогій, матэматыкі, астраноміі, фізікі, хіміі, медыцынскіх навук, антрапалогіі. У 40 універсітэтах і вышэйшых адукацыйных інстытутах Германіі чытаюцца курсы лекцый па праблемах метадалогіі гістарычна-навуковых даследаванняў. Магутны інтэлектуальны патэнцыял сканцэнтраваны ў Італіі: працуе шэраг гістарычна-навуковых таварыстваў, каля 90 выкладчыкаў універсітэтаў (Балонья, Катанья, Мілан, Палерма, Павія, Парма, Піза, Рым і інш.) вядуць прафесіянальныя даследаванні ў гэтай сферы.

Вялікую каардынацыйную работу вядзе Расійскі нацыянальны камітэт РАН па гісторыі навукі і тэхнікі, па гісторыі філасофіі навукі, якая ахоплівае 1 700 даследчыкаў, аб'яднаных у 29 секцый.

Вядуцца таксама распрацоўкі па тых пытаннях, якія не прадстаўлены ў іншых еўрапейскіх цэнтрах. Гэта — гісторыя навукі металургіі, ваеннай справы і тэхнікі, карабле- і авіябудавання, касманаўтыкі, хімічнай індустрыі, будаўнічай тэхналогіі, крыніцазнаўства і гістарыяграфіі. Рэгіянальныя цэнтры акрамя Масквы і Санкт-Пецярбурга функцыяніруюць у Томску, Туле, Ніжнім Ноўгарадзе і іншых гарадах, а таксама ў Татарстане, Чувашыі, Бурацconfigured.

Плённа працуюць спецыялісты па гісторыі навукі і тэхнікі ў Латвіі, Літве, Эстоніі.

У цяперашні час у многіх еўрапейскіх дзяржавах стварыліся і працуюць навуковыя цэнтры, паспяхова рэалізуюцца доследныя праекты. Павялічваецца колькасць вучоных у гэтай сферы, спецыяльных выданняў і асобных публікацый. Але яшчэ не ўсе іх вынікі тэарэтычна асэнсаваны і абагульнены.

У дыскусіях у Страсбургу ўдзельнічалі філосафы, сацыёлагі, грамадзянскія гісторыкі, прадстаўнікі дакладных і прыродазнаўчых навук. Размова ішла аб пераходзе ад чыста сістэматызаванага апісання поспехаў навукі мінулых эпох да тэарэтычнага асэнсавання і будавання адпаведных тэарэтычных мадэляў.

Вылучаліся тры этапы ў змене асноўнага зместу гісторыі. На першым этапе надавалася ўвага пераважна храналагічнай сістэматызацыі поспехаў той або іншай сферы навукі. На другім — апісанню развіцця навуковых ідэй і праблем. Трэці этап характарызаваўся ўзмацненнем увагі да "чалавечага элемента" навукі. Паводле меркаванняў дакладчыкаў, мэта гістарычна-навуковага аналізу — гэта высвятленне заканамернасці развіцця навукі, а таксама ўмоў і фактараў, якія гэтаму садзейнічаюць, і яно павінна быць прасякнута духам соцыякультурнага, псіхалагічнага і сацыялагічнага аналізу.

У ходзе абмеркавання многія дакладчыкі падкрэслівалі неабходнасць вывучэння міжнацыянальнага характару генезісу гістарычна-навуковай думкі, які праяўляўся ва ўзаемадзеянні навуковых канцэпцый, што фарміраваліся ў розных краінах. У гістарычна-навуковых даследаваннях заўсёды было адзінства нацыянальнага і ўсеагульнага. У выніку гісторыя навукі кожнай дзяржавы — гэта частка сусветнага інтэлектуальнага прагрэсу. Аднак у адрозненне ад іншых гістарычных дысцыплін гісторыя навукі амаль не адпавядае універсітэцкім і школьным праграмам, хоць яна адыгрывае важную ролю ў адукацыйнай палітыцы дзяржавы.

На форуме былі прадстаўлены матэрыялы, якія звязаны з методыкай выкладання канкрэтных гістарычных дысцыплін (Р.Сміс, В.Вебер, С.Дэль Кампо, М.Томас, П.Холмберг і інш.). Былі таксама абмеркаваны і канкрэтызаваны — з мэтай фарміравання ў школьнікаў і студэнцкай моладзі пазнавальнай актыўнасці — асноўныя накірункі пашырэння даследаванняў па гісторыі навукі, без якіх немагчыма набыццё паўнацэнных ведаў у навуцы, тэхналогіях, гуманітарных і сацыяльных распрацоўках.

Адбыўся канструктыўны абмен думкамі пра магчымасць пашырэння інфармацыйных кантактаў з каардынатарам даследчых праграм у сферы гісторыі навукі ЮНЕСКА кіраўніком Цэнтра еўрапейскай гісторыі медыцыны Універсітэта Луіса Пастэра прафесарам Клодам Дэбру, дырэктарам Санкт-Пецярбургскага аддзялення Інстытута гісторыі прыродазнаўства і тэхнікі РАН прафесарам Э.Колчынскім, прэзідэнтам Балтыйскай асацыяцыі гісторыі і філасофіі навукі прафесарам Ё.Крыстапайцісам, супрацоўнікам Цэнтра гісторыі навукі і тэхнікі Льежскага універсітэта (Бельгія) Б.Севярынсам.

Падчас работы "круглага стала" члены навуковага супольніцтва былі азнаёмлены з дзейнасцю Камісіі па гісторыі навукі пры прэзідэнце НАН Беларусі, з асноўнымі накірункамі гістарычна-навуковых даследаванняў, асобнымі друкаванымі выданнямі па гэтай праблеме.

Аўтар гэтага артыкула быў абраны членам Міжнароднага гістарычна-навуковага камітэта Рэспублікі Беларусь.

Канферэнцыя дала вялікі матэрыял, які будзе карысны ў вызначэнні далейшых перспектыў гістарычна-навуковых даследаванняў.

Трэба адзначыць, што пачатак гэтым даследаванням у рэспубліцы палажыла стварэнне ў 1980 г. аддзела гісторыі навукі Інстытута гісторыі Акадэміі навук. За гэты перыяд былі праведзены комплексныя даследаванні па гісторыі гістарычнай навукі, вывучэнне кадравага патэнцыялу навукі. Выдадзены шэраг абагульняючых прац і манаграфічных работ. Ліквідацыя з пачатку 90-х гг. аддзела гісторыі навукі прывяла да адставання ў распрацоўцы перспектыўнага накірунку — гісторыі навукі і тэхнікі, хоць ва ўсіх еўрапейскіх краінах гэтыя распрацоўкі атрымалі новы імпульс, пашырыўся іх творчы дыяпазон.

З 1994 г., пасля стварэння па ініцыятыве акадэміка М.Барысевіча Камісіі па гісторыі навукі пры прэзідэнце НАН Беларусі, гэта работа актывізавалася.

На наш погляд, у наш час неабходна стварыць аддзел гісторыі навукі ў структуры Інстытута гісторыі НАН Беларусі, узнавіць падрыхтоўку (цераз аспірантуру і дактарантуру) кваліфікаваных спецыялістаў, што будзе садзейнічаць станаўленню і развіццю навуковых школ, дазволіць прыступіць да даследаванняў па фарміраванні фізічных, матэматычных, хімічных, біялагічных, сельскагаспадарчых ведаў і інш.

Указаныя прапановы ненадуманыя. Яны прадыктаваны жыццём, сусветнымі тэндэнцыямі. Канструктыўны падыход да рашэння пастаўленых задач дасць магчымасць у бліжэйшыя гады аднавіць у рэспубліцы гістарычна-навуковыя даследаванні ў поўным маштабе, стымуляваць далейшы пошук. У цяперашні час беларускія вучоныя атрымалі запрашэнні з Павіянскага універсітэта (Італія), Будапешта (Венгрыя), дзе ў 1999 г. пройдуць Міжнародныя кангрэсы па гісторыі і філасофіі навукі. Такія кантакты маюць узаемаабагачальны характар, садзейнічаюць умацаванню супрацоўніцтва гісторыкаў, росту іх міжнароднага прызнання.

**Георгій Карзенка,**
**доктар гістарычных навук.**

***

На скрыжаванні аўтамабільных дарог на Смаргонь, Маладзечна, Ашмяны месціцца мястэчка Крэва. Гэтае старажытнае паселішча было сведкам многіх гістарычных падзей. У XIII ст. Крэва — сталіца Нальшанскай (Нальшчанскай) зямлі. На пачатку XIV ст. вялікі князь Беларуска-Літоўскай дзяржавы Гедзімін пабудаваў тут мураваны замак, руіны якога засталіся да нашых дзён. У 1382 г. у падзямеллі цэнтральнай вежы па загаду Ягайлы задушылі яго дзядзьку князя Кейстута, асноўнага прэтэндэнта на велікакняжацкі прастол і галоўнага праціўніка Ягайлы. А 14 жніўня 1385 г. тут была заключана Крэўская унія паміж Вялікім княствам Літоўскім і Польскім каралеўствам. Гэта далёка не ўсе гістарычныя падзеі, якія адбываліся ў Крэве.

**Сёлета 9 кастрычніка ў Крэве адбылася міжнародная навуковая канферэнцыя "Крэва: гісторыя і сучаснасць".** У ёй бралі ўдзел старшыня Беларускага фонду культуры Уладзімір Гілеп, доктар гістарычных навук, прафесар Анатоль Грыцкевіч, польскі архітэктар-рэстаўратар прафесар Тадэвуш Поляк, літоўскі архітэктар-рэстаўратар прафесар Іонас Глямжа, старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў Уладзімір Някляеў, кандыдаты гістарычных навук Алег Трусаў, Міхась Спірыдонаў, Ігар Чарняўскі, народны артыст Беларусі Валянцін Белахвосцік і іншыя.

Падчас канферэнцыі адбыўся арганізацыйны сход па стварэнні міжнароднага фонду "Крэва". Прыняты статут фонду, выбрана рада ў складзе 15 чалавек. Яе ўзначаліў паэт Уладзімір Някляеў, дарэчы, ураджэнец Крэва. Яго намеснікам абраны вядомы археолаг Сяргей Тарасаў.

У рабоце навуковай канферэнцыі і арганізацыйнага сходу прынялі ўдзел настаўнікі гісторыі Смаргонскага раёна і старшакласнікі Крэўскай сярэдняй школы.

Гэта канферэнцыя праведзена па праграме Беларускага фонду культуры "Малыя гарады і паселішчы Беларусі".

**Віктар Шоць,**
**настаўнік гісторыі Крэўскай сярэдняй школы**
**Смаргонскага раёна.**